## ПАЛЮБІЛІСЯ МНЕ...

Ў Беларусі шумелі Кастрычніка хвалі...
Мая вёска глядзела ў мяцежную даль.
А ратаі там вольнасьць, надзеі хавалі,—
аджывала мінуўшчыны здань...

Шчыра вёска агортвала песьняй дзявочай
тады сына кужэльнай сям'і.
Загарэлася сэрца, сэрца ды вочы—
земляробам стаў жыць на зямлі...

З тэй пары у завульлі вясковым
спадабаліся сьпевы дзяўчат;
карагоды на сонцы вясковым
палюбіліся мне... Ой, гучаць!

Як вясною на прызьбе расьсядуцца
красуні-дзевачкі—любата;
ў гарыню шумы, зыкі ўзьнімаюцца,
як пачнуць песьні вёскі вітаць.

Песьні дзявочыя—вясельлі дзявочыя—
гымны гэтай працоўнай вясьне.
Вёска: як-жа ахвочы я
слухаць іх... Палюбіліся мне!..